# ФАРМІРАВАННЕ Ў ВУЧНЯЎ І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ ЎМЕННЯ АНАЛІЗВАЦЬ МАСТАЦКІ ТВОР

***А. А. Селятыцкая***

**ГрДУ (Гродна )**

***Навук. кіраўн. – А. М. Лапкоўская, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя**. У артыкуле раскрываецца сістэма прыватных уменняў вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, арыентаваных на разуменне асобных кампанентаў мастацкага твора, разглядаюцца псіхалагічныя заканамернасці развіцця працэсу сэнсавага аналізу тэксту на ўроках літаратурнага чытання.

**Ключавыя словы**: мастацкі твор; аналіз тэксту; уменне; вучні I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Літаратурнае развіццё – працэс працяглы і складаны, які пачынаецца з першых крокаў далучэння вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі да сапраўднай літаратуры на ўроках літаратурнага чытання. Асвоіць духоўны патэнцыял мастацкага твора можа толькі кваліфікаваны чытач. Шлях да паўнавартаснага ўспрымання ляжыць праз перачытванне і аналіз тэксту, праз авалоданне чытацкімі ўменнямі.

«Уменне трактуецца ў методыцы як гатоўнасць, здольнасць эфектыўна выконваць дзеянні ў адпаведнасці з мэтамі і ўмовамі, у якіх даводзіцца дзейнічаць. Фарміраванне гэтых уменняў павінна абапірацца на веданне гэтых умоў, гэта значыць, на элементарныя ўяўленні пра прыроду мастацкай літаратуры і на авалоданне спосабамі дзеяння, г.зн. прыёмамі аналізу тэксту» [1, с. 7].

Адрозніваюць уменні першасныя – блізкія да навыкаў, якія паддаюцца аўтаматызацыі, і другасныя – уменні, якія прадвызначаюць элемент творчасці. Уменне аналізаваць мастацкі твор – уменне другаснае, якое прадугледжвае творчасць вучня, здольнасць знайсці рашэнне ў тым выпадку, калі «...загадзя невядомы набор правілаў і аперацый, паслядоўнасць якіх прыводзіць да мэты» [1, с. 8]. Таму гэта ўменне не можа быць сфарміравана шляхам выканання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спецыяльных практыкаванняў, адпрацоўкі паслядоўнасці дзеянняў. Авалоданне ім адбываецца ў працэсе творчай дзейнасці вучняў, у працэсе чытання і аналізу твора.

Сучаснае літаратуразнаўства разглядае ўменне аналізаваць твор як сістэму прыватных уменняў, арыентаваных на разуменне асобных кампанентаў твора.

*1. Уменне ўспрымаць выяўленча-выразныя сродкі мовы ў адпаведнасці з іх функцыяй у мастацкім творы.* Гэта ўменне прадугледжвае аналіз пабудовы фразы, выбару слова, аўтарскага выбару ў пабудове фраз. Вучань вучыцца аднаўляць ва ўяўленні карціны жыцця, вобразы герояў, спасцігаць аўтарскую ацэнку ў залежнасці ад аўтарскага выбару слоў. Фарміраванню дадзенага ўмення спрыяюць: 1) падбор сінонімаў з мэтай асэнсавання адценняў значэння слоў; 2) супастаўленне аўтарскага тэксту са спецыяльна скажоным варыянтам; 3) вылучэнне выяўленча-выразных сродкаў мовы з мэтай аднаўлення карцін прыроды, характарыстыкі персанажаў, выяўлення аўтарскай пазіцыі.

*2. Уменне аднаўляць ва ўяўленні карціны жыцця, намаляваныя пісьменнікам.* Гэта ўменне цесна звязана з папярэднім уменнем, але не зводзіцца да яго. Фарміраванне дадзенага ўмення абапіраецца на пачатковае ўяўленне пра суадносіны мастацкай літаратуры і рэчаіснасці, выражанае ў даступнай дзецям форме, і на разуменне адрознення паміж ацэнкай апавядання як твора мастацтва і выражэннем адносін да жыцця, што адлюстравана ў апавяданні. Узнаўленню вобразаў спрыяе аналіз ілюстрацыі, графічнае і слоўнае маляванне.

*3. Уменне ўсталёўваць прычынна-выніковыя сувязі, бачыць суаднесенасць эпізодаў, разумець логіку развіцця дзеяння.* Істотным элементам апавядання з'яўляецца сюжэт, які ўяўляе сабой сістэму падзей у творы. Каб успрымаць падзеі як сістэму, прасачыць змену эмацыйнай танальнасці, убачыць, як раскрываюцца вобразы герояў, неабходна зразумець закон злучэння эпізодаў, таму што ў кампазіцыі адлюстроўваецца бачанне свету. Таму фарміраванне дадзенага ўмення магчыма толькі на аснове ўяўлення пра кампазіцыю. Найбольш эфектыўны прыём, які дазваляе зрабіць неабходныя назіранні, – складанне плана, заснаванага на вычляненні кампазіцыйных элементаў апавядання.

*4. Уменне цэласна ўспрымаць вобраз-персанаж як адзін з кампанентаў мастацкага твора, што служыць для раскрыцця ідэі.* Цэласнае ўспрыманне прадвызначае, што чытач ўсведамляе матывы паводзін персанажа, суадносіць паміж сабой учынкі, перажыванні героя, аўтарскае стаўленне да яго. Ва ўяўленні ствараецца вобраз-персанаж, да якога чытач ставіцца як да жывога чалавека (герой, створаны аўтарам для раскрыцця нейкай мэты).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Найбольш эфектыўныя наступныя прыёмы: 1) выяўленне матываў, абставін, наступстваў ад учынкаў персанажаў; 2) супастаўленне разважанняў, перажыванняў і ўчынкаў з мэтай аднаўлення вобраза-персанажа; 3) »расшыфроўка» мімікі, жэстаў, інтанацыі з мэтай выяўлення змены ўнутранага стану персанажа; 4) складанне плана апавядання, чытанне па ролях, складанне апавядання: пра героя, ад асобы героя, па аналогіі, стварэнне дыяфільмаў з мэтай асэнсавання характару і ідэі твора.

*5. Уменне бачыць аўтарскую пазіцыю ва ўсіх элементах мастацкага твора.* Калі чытач не адчувае аўтарскай ацэнкі, знаёмства з творам узбагачае яго толькі веданнем яшчэ адной жыццёвай сітуацыі, а не далучае да аўтарскага разумення жыцця, чытач не атрымлівае вопыту духоўнага. Фарміраванне дадзенага ўмення абапіраецца на ўяўленне пра аўтара як пра творцу апавядання.

*6. Уменне асэнсаваць ідэю твора.* Засваенне ідэі – гэта мэта аналізу, калі яна не дасягнута, то і дзяленне тэксту на часткі не апраўдана. Усведамленне ідэі заснавана на ўсталяванні сувязей паміж усімі элементамі мастацкага твора.

Найбольш распаўсюджаныя прыёмы, якія спрыяюць абагульненню зместу апавядання, – гэта выражэнне ідэі твора з дапамогай лагічнай формулы, якая дазваляе выйсці за межы сюжэта, зрабіць шырокае абагульненне. Варта выкарыстоўваць і такія прыёмы, як пастаноўка вучнямі пытанняў да твора, складанне апавядання па аналогіі. Пастаноўка пытанняў дазваляе падысці да ідэі праз асэнсаванне сюжэта, характараў, праз выяўленне асноўнага канфлікту твора. Складанне апавядання па аналогіі спрыяе эмацыйнаму асваенню ідэі.

Такім чынам, у рэальным працэсе ўспрымання ўсе прыватныя ўменні звязаныя паміж сабой, узаемна ўзбагачаюць адзін аднаго і павінны фарміравацца адначасова. Неабходна адзначыць, што фарміраванне ўменняў – гэта толькі сродак для дасягнення галоўнай мэты: паглыбленне ўспрымання вывучаемага твора.

Прааналізаваўшы метадычны бок даследуемай тэмы, мы звярнуліся да псіхалогіі і разгледзім псіхалагічныя заканамернасці развіцця працэсу сэнсавага аналізу тэксту.

Пры пераходзе на II ступень агульнай сярэдняй адукацыі ў многіх вучняў узнікаюць цяжкасці, звязаныя з няўменнем вылучыць у навучальным матэрыяле істотнае, галоўнае. Гэта значыць, што ў вучняў не сфармаваныя разумовыя навыкі і разумовыя працэсы, якія дазваляюць мэтанакіравана ажыццяўляць сэнсавы аналіз матэрыялу і выяўляць у ім найбольш важны змест.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такая несфарміраванасць разумовай дзейнасці прыводзіць да таго, што працэс засваення матэрыялу падмяняецца яго механічным запамінаннем. Найбольш цяжкі для разумення мастацкі тэкст. Разуменне сэнсу, асноўнай ідэі твора – складаны псіхалагічны працэс цесна звязаны са значным напрамкам разумовай дзейнасці: перафармуляваннем, абагульненнем.

Наяўныя ў псіхалагічнай літаратуры дадзеныя сведчаць пра тое, што разуменне ідэі тэксту ў сваім станаўленні праходзіць некаторыя стадыі. Не толькі вучні розных узроставых груп, але і аднаго і таго ж ўзросту могуць характарызавацца розным узроўнем развіцця сэнсавага аналізу, і гэта праяўляецца ў розным разуменні зместу твора, і яго ідэі: I стадыя – вучань не можа даць ніякага адказу; II стадыя – «паўтор», калі вучань толькі паўтарае радок твора або сказ; III стадыя – «загаловак», калі вучань у якасці галоўнай думкі прайгравае загаловак твора або толькі загаловак твора інтэрпрэтуецца ім; IV стадыя – «сінкрэт»: у якасці галоўнай думкі прыводзіцца або не зусім зразумелая асобная фраза, або разгорнуты, але няправільны пераказ твора з прыўнясеннем ўласнага зместу; V стадыя – «фабула», калі ў якасці адказу вучань пераказвае змест прачытанага твора; VI стадыя – «пачатак дыферэнцыяцыі сэнсу», калі вучань дае кароткі пераказ (усяго тэксту ці яго часткі), пасля чаго даецца заключная абагульняючая фраза, якая змяшчае выказванне пра галоўную думку мастацкага твора; VII стадыя – «поўная дыферэнцыяцыя сэнсу», калі галоўная думка твора фармулюецца вучнем правільна і дастаткова абагульнена [2, с. 17].

Вядомы псіхолаг Н. П. Лакалава рэкамендуе пры развіцці працэсаў сэнсавага аналізу пачынаць працу над тэкстам з працы над загалоўкам: асэнсаваннем, інтэрпрэтацыяй, са спробы прадбачыць, пра што пойдзе гаворка ў тэксце, з актуалізацыі наяўных у школьнікаў ведаў.

Далей настаўнік працуе над фабулай твора без прыўнясення ўласнага зместу і асабістага ўражання. Пасля таго, як фабула твора будзе прайграная дастаткова поўна і правільна, перад вучнямі ставіцца пытанне: «Што хацеў сказаць аўтар гэтым творам, якая яго галоўная думка?». Тым самым настаўнік пераводзіць вучняў на наступную прыступку, непасрэдна звязаную з выяўленнем сэнсу тэксту. Цяпер трэба вывесці вучняў на заключную фразу пра галоўную думку.

Такім чынам, кожны настаўнік зацікаўлены ў тым, каб вучням падабалася вучыцца ў школе, каб не знікала цікавасць да вучэбных прадметаў, да новых ведаў. Але ўрокі літаратурнага чытання не з’яўляюцца любімымі для большасці вучняў. Зрабіць іх больш прадуктыўнымі, больш цікавымі для вучняў – вось задача, якая будзе вырашана пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўмове, калі ў вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі будзе выпрацавана сістэма прыватных уменняў, арыентаваных на разуменне асобных кампанентаў мастацкага твора.

## *Літаратура*


1. Корст, Н. О. Очерки по методике анализа художественного произведения / Н. О. Корст. – М. : Просвещение, 1986. – 175 с.
2. Локалова, Н. П. Стадии овладения учениками литературным текстом / Н. П. Локалова // Начальная школа. – № 7 – 1996. – С. 17–25.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ